# ФИЛОСОФИЯ

УДК 273.1

## ГНАСЕАЛАГІЧНЫ АСПЕКТ ТВОРЧАЙ СПАДЧЫНЫ АЙЦА ФАБІЯНА АБРАНТОВІЧА

*Г.І. КЛІМОВІЧ*
*(Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Мінск)*

*Артыкул прысвечаны асэнсаванню творчай спадчыны айца Фабіяна Абрантовіча. Аналізуецца рэфлексія дадзенага аўтара праз прызму гнасеалагічнага аспекту. У якасці гіпотэзы высоўваецца думка аб значным уплыве на творчасць айца Фабіяна Абрантовіча гнасеалогіі тамізму і энцыклікі папы Льва XIII "Aeterni Patris". Даследуюцца асноўныя друкаваныя працы Фабіяна Абрантовіча "Касцёл і навука", "Бог", "Чалавек" з пункту гледжання суаднесення з філасофскай сістэмай тамізму. Разглядаецца асноўны тэзіс, які фундзіруе вучэнне тамізму, – высунуты Тамашам Аквінскім прынцып гармоніі веры і розуму, яго ўвасабленне ў творчасці беларускіх аўтараў на прыкладзе прац айца Фабіяна Абрантовіча, які асэнсоўвае дадзенае палажэнне ў рэчышчы класічнай тамісцкай традыцыі. У працах прыведзена тамісцкая іерархія навук: навука – філасофія – рэлігія. Акцэнтуецца ўвага на актыўным выкарыстанні доказаў існавання Бога Тамаша Аквінскага айцом Фабіянам Абрантовічам. Дадзеныя сведчанні дазваляюць даказаць гіпотэзу фундзіраванасці рэлігійна-філасофскіх поглядаў айца Фабіяна Абрантовіча ў гнасеалагічным аспекце прынцыпамі і ўстаноўкамі сістэмы тамізму.*

**Уводзіны.** Гнасеалагічная праблематыка тамісцкай філасофіі ўвасобілася ў спецыфічнай повязі канцэптаў "вера – розум", на падставе якой фарміруюцца асноўныя прынцыпы тамістычнай тэорыі пазнання. Ракурс прадстаўлены ў працах святога Тамаша Аквінскага – фундзіраванасць прынцыпам гармоніі веры і розуму: працэс пазнання – гэта сума ісцін, якая атрымліваецца з дзвюх крыніц. Першая, натуральная, – чалавечы розум. Другая, звышнатуральная, – Боскае Аб'яўленне. Першай крыніцы адпавядаюць веды, другой – вера. Розум не можа спасцігнуць усе ісціны цалкам, некаторыя з іх могуць быць атрыманы толькі шляхам веры. Але і вера, і розум маюць адну і тую ж крыніцу, інтэнцыянальна аднолькава накіраваны для спасціжэння Абсалюту, які адчыняецца чалавеку праз створаны свет натуральным чынам і праз Адкрыццё – звышнатуральным. Прынцыповы момант тое, што вера можа і павінна спасылацца на розум у якасці натуральнага апірышча, чалавечы розум пакліканы даць рацыянальнае абгрунтаванне веры [1, с. 8].

Канец XIX – пачатак XX стагоддзя адзначыліся шэрагам навуковых адкрыццяў, якія прывялі да змены навуковай парадыгмы. Другая характарыстыка дадзенага часу – узмацненне сацыяльнай і інтэлектуальнай актыўнасці, з'яўленне новых філасофскіх тэорый, сутнасць якіх часам вяла да ірацыяналізму і агнастыцызму, адначасова ідэалогія дадзеных плыняў пагражала зместу праграмных установак хрысціянскага светапогляду. Каталіцкая царква вымушана была прыняць выклік часу, адказ быў рэпрэзентаваны ў энцыкліцы папы Лявона XIII "Aeterni Patris". Дадзеная энцыкліка паклала пачатак новай плыні каталіцкай філасофіі – неасхаластыцы, асноўнай мэтай якой было адраджэнне і адапатацыя сістэмы Тамаша Аквінскага да рэалій XX стагоддзя ў якасці philosophia perennis. Адным з найбольш актуальных пытанняў, якія закраналіся ў праблемным полі неатамізму, і яго папярэдняга этапу – тамізму, была тэматыка ўзаемаадносін веры і розуму. У трансфармаваным варыянце ў выніку асноўны яе змест складаюць наступныя палажэнні:

1) аўтэнтычны прынцып дзвюх ісцін у спробе дасягнення гармоніі ў дыялогу паміж верай і розумам;
2) інтэрпрэтацыя ў ідэалістычным накірунку дасягненняў прыродазнаўства і вынікаў НТР;
3) выкарыстанне "прынцыпа аналогій" у гнасеалогіі;
4) песімістычная адзнака сцыентызму і сацыяльных вынікаў навукова-тэхнічнага прагрэсу.

Мэта дадзенага артыкула – прасачыць ступень увасаблення прыведзеных вышэй тэзісаў у беларускай каталіцкай думцы на прыкладзе творчасці а. Фабіяна Абрантовіча, што дапаможа адказаць на пытанне, ці ў поўнай меры засвоіла беларуская думка тамістычную плынь у гнасеалагічным аспекце? Што ў сваю чаргу часткова дазваляе даць адказ на пытанне аб змястоўнай, ідэалагічнай і часовай адпаведнасці беларускай інтэлектуальнай гісторыі (у дадзеным выпадку – каталіцызм) заходнееўрапейскай.

**Асноўная частка.** У творчасці беларускіх каталіцкіх інтэлектуалаў гнасеалагічны аспект асэнсоўваецца ў некалькі этапаў, для кожнага з якіх характэрна агульнасць поглядаў, тэматыкі і палажэнняў. Так, для першага этапу (1907 – 1945) уласцівы класічны тамісцкі ракурс узаемаадносін веры і розуму, фундзіраваны наступнымі палажэннямі вучэння Тамаша Аквінскага: тэорыя гармоніі веры і розуму, розум як апірышча веры, вера як спалучэнне розуму і акта вольнай волі, іерархічная класіфікацыя навук і г.д. У гэты перыяд працавалі а. Фабіян Абрантовіч, а. Ідэльфонс Бобіч, а. Ян Тарасевіч, а. Адам Станкевіч, а. Баляслаў Пачопка. Усе дадзеныя аўтары, акрамя а. Баляслава Пачопкі, прытрымліваліся тамісцкай пазіцыі ў адносінах да праблематыкі пазнання.

Для другога перыяду (1945 – 1990), акрамя вышэйпералічаных палажэнняў, характэрны зварот да прыродазнаўчай тэматыкі ў якасці яшчэ аднаго аргумента на карысць крэацыянізму. У той жа час аўтары працягваюць фундзіраваць рэфлексію праграмным тэзісам вучэння тамізму аб гармоніі веры і розуму. Да дадзенага перыяду трэба аднесці творчасць а. Льва Гарошкі, а. Петра Татарыновіча, а. Чэслава Сіповіча, а. Тамаша Падзявы. Працягвае працаваць а. Ян Тарасевіч.

Даследаванне творчай спадчыны а. Фабіяна Абрантовіча актуальна з пункту гледжання айчыннай гісторыі філасофіі. Гэта асоба, якая спрычынілася да шматлікіх інтэлектуальных працэсаў, якія адбываліся на беларускіх абшарах у перыяд з 1907 па 1939 год: станаўленне беларускага касцёла, нацыянальнае адраджэнне, дзейнасць ордэна айцоў-марыянаў. Нягледзячы на шматлікія дасягненні а. Фабіяна Абрантовіча перад беларусамі і касцёлам (а. Фабіян Абрантовіч з'яўляецца бласлаўлёным), багатую творчую спадчыну, дадзенае імя не ўзгадваецца ў падручніках па айчыннай гісторыі і гісторыі філасофскай і грамадскай думкі, адсутнічаюць даследаванні, прысвечаныя аналізу поглядаў і рэфлексіі. Айцец Фабіян Абрантовіч (1884 – прыкладна 1946) – духоўная каталіцкая асоба ўсходняга абраду, марыянін, магістр тэалогіі, доктар філасофіі, настаўнік, філосаф і публіцыст [2, с. 6]. Яшчэ падчас студэнцкіх гадоў меў магчымасць стажыравацца за мяжой і ў поўнай меры засвоіць заходнееўрапейскую традыцыю тамізму:

"Як аднаго з найбольш выдатных вучняў у Акадэміі паслалі яго царкоўныя ўлады на далейшыя студыі ў Заходнюю Эўропу. Выбар выпаў на каталіцкі Унівэрсітэт у Бэльгіі ў Лувэне, які славіўся тады асабліва высокім узроўнем навукі наогул і пашырэннем кірунку, ведамага ў філязофіі пад назовам нэосхалястыкі. У Лювэне закончыў студыі а. Фабіян Абрантовіч са ступеняй доктара філязофіі, пішучы навуковую працу на тэму філязафічных канцэпцыяў Лоскага і Тамаша Аквінскага. Паколькі ведама, а. Фабіян Абрантовіч быў першым беларусам, які кончыў вышэйшыя студыі ў Лювэнскім універсітэце з тытулам доктара" [3, с. 10].

Айцец Фабіян Абрантовіч – адзін з першых беларускіх аўтараў, які фундзіраваў творчасць прынцыпамі энцыклікі Льва XIII "Aeterni Patris" і фармаваў гнасеалагічныя погляды ў адпаведнасці з пералічанымі раней прынцыпамі філасофіі Тамаша Аквінскага. Творчая спадчына дадзенага аўтара прадстаўлена наступнымі працамі: "Newman a modernism", "Kościół a nauka", "Бог", "Чалавек". Акрамя таго пяру а. Фабіяна Абрантовіча належыць шэраг артыкулаў, друкаваных у часопісах "Католический вестник", "Крыніца", "Хрысьціянская думка".

Айцец Фабіян Абрантовіч фармуліруе ў працах гнасеалагічную класіфікацыю, у якой прадстаўлены этапы і віды працэсу пазнання. Стадыі працэсу пазнання, фундзіраваныя метадам аналізу, зафіксаваны ў працы "Касцёл і навука" наступным чынам:

"Пазнанне – гэта сцвярджэнне якой-небудзь рэчаіснасці. Сцвярджаючы рэчаіснасць успрымаем рэчы аднолькава і розна і затым укладаем іх паводле гэтага падабенства або розніцы ў групы, або, інакш кажучы, класіфікуем.

Разкласіфікаваўшы, сцвярджаем залежнасць аднаго элемента рэчаіснасці ад другога – або прычыннасць, далей шукаем прычыны, якія кіруюць з'явамі рэчаіснасці і ёю самой" [5, с. 5].

У працы "Чалавек" аўтар артыкулюе наступныя віды: звычайнае пазнанне, навуковае, філосафскае пазнанне, вера:

"Звычайны здаровы розум, каторы бача, сцвярджае, што рэчы ёсць і як яны ёсць, не заходзячы вельмі далёка ў шуканні прычын. Гэта – прыродная крыніца і пачатак уселякага пазнання. Навуковае пазнанне рацыі – розьніцца ад звычайнага тым, што ёсць агульнай, сістэматычнай, пэўнай ведай усяго праз бліжэйшыя і далейшыя прычыны. Філозофічнае пазнанне паступае далей ад навуковага, шукае найдалейшых прычын. Розум людзкі не заспакойваецца абы чым. Вера. Праз веру тут разумеем ня веру рэлігійную (з розуму, волі і ласкі), але звычайную здольнасць чалавечага розуму да прызнавання за праўду таго, што хто іншы гавора. Вера такая займае дзевядзьдесят сотых у нашым жыцці" [6, с. 12 – 13].

Далейшая распроўка дадзенай тэматыкі была прадстаўлена ў працах а. Льва Гарошкі, найбольш вядомым з якіх з'яўляецца твор "Навука і рэлігія".

Тэме ўзаемаадносін веры і розуму прысвечана праца "Касцёл і навука" (Вільня, 1912). Адзначаючы актуальнасць дадзенага пытання, аўтар імкнецца даць тэарэтычны і гістарычны нарыс развіцця праблематыкі ў межах каталіцкай царквы.

Аналагічна тамісцкай класіфікацыі, а. Фабіян Абрантовіч прапаноўвае іерархічную класіфікацыю навук, адзначаючы, што праблемнае поле эмпірычных навук складаюць знешнія прычыны і таму яны займаюць апошняе месца, філасофія вывучае ўнутраныя найагульнейшыя прычыны і таму перавышае эмпірычныя навукі. Узначалівае дадзеную іерархію тэалогія як навука, аб'ектам якой ёсць звышнатуральная (а як следства, найбольш каштоўная) рэчаіснасць Аб'яўлення. Акрамя таго, тэалогія мае справу з найвышэйшай прычынай і асновай рэчаіснасці – Абсалютам [5, с. 8].

Айцец Фабіян Абрантовіч выкарыстоўвае ў працы вышэйузгаданы прынцып тамізму аб розуме як натуральным апірышчы веры:

"Усе вышэйпрапанаваныя пункты зыходзяцца ў чалавеку, яго розуме, яго душы. Розум ёсць падставай навукі і веры. Без яго ні ведаць, ні верыць немагчыма" [4, с. 8].

У працы а. Фабіяна Абрантовіча рэпрэзентаваны ў класічным тамісцкім ракурсы канцэпт узаемаадносін катэгорый веры і розуму, паводле якога Аб'яўленне (вера) і веды маюць адну крыніцу, але займаюць розныя вобласці пазнання. Мэтанакіравана абгрунтоўваючы адсутнасць супярэчнасцяў паміж верай і розумам, абапіраючыся на класічны для тамізму тэзіс перавышэння ісцін розуму ісцінамі веры, а. Фабіян Абрантовіч піша:

"Апіраючыся на вопыт, г. зн. на сцвярджэнні таго, што ёсць, адзначылі ўжо, што прызнанне належных правоў за розумам ёсць падставай для ведаў пра веру. Таксама, паводле Касцёла, Аб'яўленне ня пярэчыць навуцы, але знаходзіцца па-над ім. Не такім чынам, быццам розум яго дасягнуць ня мог, але так, што пазнанне асноваў Аб'яўлення мае сваю крыніцу ў розуме, у вопыце" [5, с. 8].

У адпаведнасці з тамісцкай плыняй аўтар разглядае веру як катэгорыю, фундзіраваную прынцыпам вольнай волі:

"Адсюль вынікае, што пытанне веры або неверы ня ёсць толькі пытаннем розуму, але галоўна пытаннем вольнай волі, тут думка пераходзіць у іншую вобласць, але гэта ня наша сённяшняя тэма" [5, с. 9].

Далейшае развіццё гнасеалагічныя погляды а. Фабіяна Абрантовіча атрымалі ў працы "Бог" у выглядзе наступных тэзісаў:

1) атэізм – толькі часовы, пераходны этап у развіцці чалавечай культуры, повязь паміж этапамі веры:

"Усюды, заўсёды і ўсе народы Бога прызнавалі, а сённяшнія досьледы навуковыя сцвярджаюць, што чым прымітыўнейшы, дзічэйшы народ, тым чысьцейшае, меньш грубое паняцце аб Богу захаваў. Недаверства было і ёсць пладом сапсутай культуры, дый заўсёды было і ёсць вельмі малым працэнтам усяго роду чалавечага і то – пераходным – гэта знача: паяўлялася і прападала" [7, с. 3];

2) некаторыя тэалагічныя катэгорыі немагчыма ідэнтыфіцыраваць з дапамогай розуму, бо як сцвярджаў а. Фабіян Абрантовіч раней у першай працы "Касцёл і навука" ісціны веры і розуму належаць да розных абласцей. Падкрэсліваецца немагчымасць пазнання Абсалюту з пункту гледжання звычайных разумовых здольнасцей чалавека. Дадзенае палажэнне з'яўляецца актуальным і для працы "Бог":

"А Бог самаістны і дзеля таго да Бога ня можна прыкладаць ані нашага спосабу, ані бытавання агранічанага, ня можна ставіць пытання, адкуль Бог узяўся, ані куды ідзе, не дзеля таго, што Бог гэткага пытання баіцца і адказаць ня зможа, але дзяля таго, што гэта праціўна логіцы з нашай стараны" [7, с. 8];

3) тэалагічныя праўды, заснаваныя на веры ў адпаведнасці з таміскай пазіцыяй патрабуюць акрамя розуму вольнай волі:

"Існаванне Бога належа да праўдаў так званых маральных, а гэтыя праўды не саўсім відавочныя, як прыкладам два да адзін – тры, 2 + 2 = 4 і толькі, але вымагаюць яснай развагі і добрай волі чалавека, каб на іх згадзіўся і прызнаў" [7, с. 11];

4) у адпаведнасці з тамісцкім пунктам гледжання а. Фабіян Абрантовіч абгрунтоўвае існаванне Бога і з рацыянальных пазіцый, выкарыстоўваючы натуразнаўчыя, філасофскія і тэалагічныя доказы. Апошнія абапіраюцца на аўтарытэт Святога Пісання і маюць апірышчам, як было паказана раней, акрамя розуму вольную волю [7, с. 11].

Доказы існавання Абсалюту аўтар падмацоўвае апошнімі навуковымі дасягненнямі. Так, на думку а. Фабіяна Абрантовіча, на карысць Бога сведчаць наступныя палажэнні, якія могуць разглядацца як факт існавання Абсалюту:

"Што такое і адкуль матэрыя ці энэргія? Адкуль і як узяўся першы рух? Адкуль у свеце парадак, разумнае ўстройства ўсяго? Адкуль жыццё на зямлі ў такіх багатых праявах і формах? Адкуль паўстанне першай свядомасці ў арганізме жывым? Як, адкуль паўстала мысль, думка чалавечая? Адкуль у чалавеку факт існавання добрай волі і розьніц паміж дабром і злом?" [7, с. 14 – 18].

Трэба адзначыць, што асноўны блок доказаў, прыведзеных а. Фабіянам Абрантовічам складаюць варыяцыі на тэму класічных доказаў існавання Абсалюту Тамаша Аквінскага. Так, напрыклад, аўтар звяртаецца да доказу аб першапрычыне. Рэфлексія а. Фабіяна Абрантовіча ў дадзеным накірунку разгортваецца наступным чынам:

"З гэтых законаў і мыслення, і бытавання найважнейшы першы: прычыннасці і рацыі. Усе загадкі, іксы асобных навук, скажам нашы 7 загадак, паасобна дамагаюцца існавання Бога, яго беспасрэднай акцыі. Але, скажам, што некаторыя з іх даліся-б развязаць бяз гэтай беспасрэднай інтэрвенцыі Божай, то цэлы свет як такі, відомы і невідомы становіць адну замкнутую цэласць, каторая мусіць мець рацыю, бо калі кожная рэч мае сваю прычыну, тож сума ўсіх рачэй (свет) без прычыны тым больш існаваць ня можа. Усе навукі і філозофія бачаць, што свет гэтай прычыны, рацыі сам у сабе не мае, бо складаецца з паасобных часцін, з каторых адна ад другой залежаць. Каб тады свет вытлумачыць, – больш, каб свет мог істнаваць (а ён істнуе), трэба выйсці ў засвет, да Бога. Бог ужо прычыны ня мае, бо каб яе меў, быў-бы часткай свету, як усё іншае, але мае сам у сабе рацыю ў тым, што ён не ставаўся, не пачынаўся, ня скончыцца, але вечна Ёсць. Калі асобныя навуковыя доказы істнавання Богу могуць падлягаць спору, то толькі таму, што не трымаюцца філозофічных, або лепш – філозофічнага з патрэбнай яснасцю і сцісласцю" [7, с. 20 – 21].

Айцец Фабіян Абрантовіч актыўна карыстаецца пятым доказам існавання Абсалюту – т. зв. доказам аб парадку і мэтазгоднасці, які атрымаў у далейшым шырокую папулярнасць у беларускіх каталіцкіх аўта-

раў. Так яго наяўнасць прасочваецца ў працах а. Льва Гарошкі, а. Чэслава Сіповіча, а. Тамаша Падзявы. Рэфлексія на дадзеную тэму ў працы а. Фабіяна Абрантовіча прыведзена ў класічным для тамізму варыянце:

"Адкуль у свеце парадак, разумнае ўстройства ўсяго? Калі самі гэтага парадку, сістэмнасці, ладу, цэловасці ня бачым ані ў саміх, ані вокал сябе, спытайма астраномаў, фізікаў, хімікаў, біолагаў, гісторыкаў і г.д. – а яны нам скажуць, што свет устроены пад меру і вагу, што збудаваны па плане і то не абы якім. Аб прыпадку гаварыць не прыходзіцца, хіба жартам, бо прыпадкам у жыцці штодзенным завем тое, чаго прычыны ня бачым, але гэта ня знача, што яе няма, або што якое-небудзь здарэнне не мае свайго значэння. Аб так званым зле, цярпенні пагаворым у трэццяй часці нашага аб Богу нарысу, а цяпер мусім заканклюдаваць (заключыць), што тым, хто план свету саставіў і па плану свет ўстроіў ёсць Бог, найвышэйшы Розум. Бяз Бога быў-бы хаос, непарадак, брыдота, або скажам лепш – нічога не было-б: ані непарадку, ані хаосу – бо паняцця непарадку, нябыту ёсць толькі паняццямі, каторыя могуць паўстаць з парадку і быту – а не наадварот. Паняцця пазітыўныя пры негатыўных выясняюцца толькі, а не паўстаюць з іх. Нішто ня ёсць, але яго няма" [7, с. 15 – 16].

У працы "Бог" а. Фабіян Абрантовіч зноў выкарыстоўвае тамістычную класіфікацыю навук, адначасова разглядаючы філасофію не як форму грамадскай свядомасці, а менавіта як навуку, якая перавышае прыкладныя (натуразнаўчыя і гуманітарныя) навукі, аб'ектам даследавання першых ёсць толькі факты, у той час як філасофія ўсталёўвае сувязь паміж фактамі:

"Філазофія ёсць навукай навук. Кожная паасобная навука мае свой уласны аб'ект (прадмет), метады (дарогі) і, пазнаўшы найбліжэйшыя прычыны гэтых сваіх аб'ектаў, даходзіць да якагась недведамага Х і тут затрымоўваецца, як гэта мы бачылі ў сямі загадках свету. Навукі фізічныя, прыродазнаўства, разглядаюць усе прыметы і правы матэрыі – фізічныя, хімічныя, механічныя, біялагічныя, але ўжо гэтая матэрыя, жыццё, скуль яны? – прыродазнаўства не ведае – перадае гэтыя пытанні на разгляд філазофіі. Таксама навукі гуманітарныя апісваюць і знаюць правы чалавека як адзінкі, сям'і, грамадзянства – адступаюць навукам філозофічным" [7, с. 19].

**Заключэнне.** На аснове вышэйпрыведзенага факталагічнага матэрыялу можна зрабіць выснову, што ў гнасеалагічным аспекце творчасць а. Фабіяна Абрантовіча адносіцца да тамісцкай плыні. Дадзены аўтар падзяляе гнасеалагічную тамісцкую пазіцыю ў прынцыпы гармоніі веры і розуму, разглядаючы веру як вобласць, якая знаходзіцца па-над розумам і мае ў ім крыніцу, розум як апірышча веры, веру як акт розуму і вольнай волі, прыводзіць тамісцкую класіфікацыю навук і папулярызуе тамісцкія доказы існавання Абсалюту. На прыкладзе творчасці а. Фабіяна Абрантовіча можна казаць, што беларуская каталіцкая інтэлектуальная думка ўспрыняла заклік Льва XIII і пачала будаваць уласную творчасць, актыўна выкарыстоўваючы тамісцкія прынцыпы і фарміруючы беларускую неатамісцкую традыцыю.

ЛІТАРАТУРА


1. Гараджа, В.И. Неотомизм и наука / В.И. Гараджа. – М.: Знание, 1968. – 48 с.
2. Garbiński, J. Białoruski ruch chrześcijański XX wieku. Słowni biograficzno-bibliograficzny / J. Garbiński, J. Turonek. – Warszawa: PAN, Instytut Sławistyki, 2003. – 520 s.
3. Сіповіч, Ч. Айцец Архімандрыт Фабіян Абрантовіч / Ч. Сіповіч // Божым шляхам. – 1957. – № 76 – 81. – С. 9 – 20.
4. Коротков, Н.Д. Неотомизм – философия псевдорационализма / Н.Д. Коротков. – Киев: Вища школа, 1986. – 79 с.
5. Abrantowicz, F. Kościół a nauka / F. Abrantowicz. – Wilno; [s.n.], 1912. – 32 s.
6. Абрантовіч, Ф. Чалавек / Ф. Абрантовіч. – Вільня, 1928. – 16 с.
7. Абрантовіч, Ф. Бог. Філасофска-тэалагічны нарыс / Ф. Абрантовіч. – Вільня, 1929. – 24 с.


*Паступіў 17.09.2011*

## EPISTEMOLOGICAL ASPECT OF THE FATHER FABIAN ABRANTOVICH WORK HERITAGE

***H. KLIMOVICH***

*The article is devoted the understanding of the intellectual heritage of father Fabian Abrantovich. This article analyzes the reflection Fabian Abarantovich through the prism of the epistemological perspective. The author puts forward the idea of the hypothesis of a significant impact on the Fabian Abrantovich's works the Thomistic philosophy and the ideas, represented in the encyclic of Pope Leo XIII "Aeterni Patris". The aim of the article is the investigation the main works of Fabian Abrantovich "The church and science", "God", "Man" in terms of their correlation with the philosophy of Thomism. The article analyses the use in the work of Fabian Abrantovich basic principles of Thomism epistemology: the principle of harmony between faith and reason, Thomist hierarchy of sciences, the use of evidence for the existence of God Thomas Aquinas.*